СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі.

# СТАЛІНЕЦ

ОРГАН ГРЭСКАГА РК КП(б)Б

№ 22 (753) | Аўторак, 18 красавіка | 1944 г.

**ПРАЧЫТАЎ, ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ**

15 і 16 красавіка наша авіяцыя дальняга дзеяння зрабіла масіраваныя налёты на порт і чыгуначную станцыю СЕВАСТОПАЛЬ і бамбардыравала скапленні войск і тэхнікі праціўніка, ваенныя склады і нямецкія суда, знаходзіўшыеся ў Севастопальскай бухце. Адзначаны сільныя ўзрывы і вялікія пажары. Прамым пападаннем бомбы патоплен стаяўшы ў парту транспарт праціўніка водазмяшчэннем 3.000 тон.

## Забяспечым высокі ўраджай

Дні вясенняга севу надышлі. Над намі ўстае вясенняе сонца перамогі. Чырвоныя воіны ідуць на захад. Дзяржаўная граніца з Чэхаславакіяй і Румыніяй ужо дасягнута. Завяршаецца вызваленне Крыма. Чырвоная Армія наступае ў вясенняе бездарожжа і распуціцу. Украіна праводзіць сеў пад аховай магутнай Чырвонай Арміі.

У нашых раёнах яшчэ гаспадарыць немец. Затуманьваючы народу вочы, немцы „надзяляюць" сялян нашай-жа роднай зямлёй. Наложаныя нямецкімі шкурадзёрамі непасільныя налогі сяляне зрываюць, уходзяць у партызаны.

Сучасная задача сялян—найбольш актыўна правесці сеў яравых. Гэты ўраджай будзе здымацца ў той час, калі наша зямля будзе свабодна ад немцаў. А пагэтаму свяшчэнны абавязак кожнага гаспадара—акуратна і своечасова правесці яравы сеў, каб забяспечыць высокі ўраджай.

Усім камандзірам партызанскіх атрадаў неабходна прыняць мерапрыемствы па ахове спакойнай працы сялян на сваіх палях, дапамагаць сялянам, сачыць за тым, каб ні аднаго гектара зямлі не пуставала.

Сяляне! Дружна правядзём яравы сеў, забяспечым сябе і нашу вызваліцельніцу родную Чырвоную Армію хлебам. Праца па полі дае хлеб, а хлеб дае сілы чырвоным воінам, а савецкія воіны даюць у каўнер немцу. Дружна праведзены сеў—гэта яшчэ адзін удар па здыхаючаму нямецкаму гаду.

## З аператыўных зводак Совінформбюро

(З 11-га ПА 18 КРАСАВІКА)

Войскі 1-га Украінскага фронта за час з 1-га па 10 красавіка нанеслі наступныя страты групіроўцы немцаў, акружанай захадней г. Скала: захоплена танкаў і самаходных гармат--187, гармат рознага калібра—121, самалётаў — 61, аўтамашын—7.483. Захоплена ў палон 6.988 немцаў. Праціўнік пакінуў на полі боя 26.000 трупаў сваіх салдат і афіцэраў. К 11-му красавіка ад акружанай групіроўкі праціўніка асталіся зборныя атрады лікам да 10.000 салдат і 80 танкаў. Войскі фронта пасля ўпорных вулічных баёў поўнасцю авалодалі абласным цэнтрам Украіны г. ТАРНОПАЛЬ. Нямецкі гарнізон горада ў 16.000 чалавек знішчан, за выключэннем 2.400 палонных.

У Румыніі нашы войскі фарсіравалі раку Серэт і занялі гарады Пашкані, Фельцічэні.

На Кішанёўскім напрамку нашы войскі занялі г. ТІРАСПАЛЬ, райцэнтры Малдаўскай ССР Дубасары, Грыгорыопаль, Слабадзея Малдаўская і 160 насялёных пунктаў.

Паўднёва-захадней г. Одэса нашы войскі занялі г. Овідзіопаль, 20 насялёных пунктаў і 6 чыгуначных станцый.

Войскі 4-га Украінскага фронта занялі сталіцу Крыма СІМФЕРОПАЛЬ і гг. Джанкой, Еўпаторыя, райцэнтры Калай, Курман-Кемельчы, Сейтлер, Біюк—Онлор, Карача-Кангіл, Джурчы, Ак-Шэйх, Бахчысарай, Алушта, Сакі, Ак-Мечэць, Фрайдорф, Зуя, Албат, 1.070 насялёных пунктаў і 25 чыгуначных станцый. Войскі фронта захапілі ў палон 20.000 салдат і афіцэраў праціўніка.

Войскі Аддзельнай Прыморскай арміі, перайшоўшы ў наступленне, прарвалі абарону немцаў на Керчанскім паўвостраве і занялі ў Крыму гг. Керч, Феадосія, Ялта, райцэнтры Сем-Калодзезей, Стары Крым, Іслам—Тэрэк, Карасубазар, Судак, Ічкі, Алупка, 520 насялёных пунктаў і 10 чыгуначных станцый. Войскі арміі захапілі ў палон 17.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

На астатніх участках фронта шлі баі мясцовага значэння.

За 7 дзён баёў на ўсіх франтах падбіта і знішчана 464 нямецкіх танкі, збіта 328 самалётаў праціўніка.

## У Прэзідыуме Вярхоўнага Совета Саюза ССР

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР ПАСТАНАВІЎ:

1. Устанавіць для ўзнагароджання асоб вышэйшага каманднага састава Чырвонай Арміі вышэйшы ваенны ордэн „ПОБЕДА".

2. Устанавіць для ўзнагароджання асоб радавога і сяржантскага састава Чырвонай Арміі, а ў авіяцыі і асоб, якія маюць званне малодшага лейтэнанта, якія вызначыліся ў баях за Совецкую Радзіму, ордэн СЛАВЫ 1, 2, і 3 ступені.

Зацверджаны статут і апісанне ордэна „ПОБЕДА" і ордэна СЛАВЫ 1, 2, і 3 ступені.

## Образ патрыятызму і адвагі

Як і ўся перадавая моладзь, комсамолка Марыя Кірэеўна Раманенка мела жаданне змагацца супроць нямецкіх акупантаў у радах слаўных партызан. І вось яна ў глыбокім варожым тыле. У атрадзе яе звалі Жана. Смелая і неўтомная, яна ўсю сваю маладую энергію васемнаццаці год аддала бязлітаснай і свяшчэннай барацьбе супроць лютага ворага. У трох ярасных баях з перавышаючымі сіламі ворага, з групай партызан Жана касіла фрыцаў з сваёй зброі, удзельнічала ў падрыве 2 нямецкіх воінскіх эшалонаў і ў другіх баявых аперацыях.

З празрэннем к смерці ішла Жана ў бой на ворага. Гітлераўцаў было ў многа разоў больш. Яны пачалі заходзіць з флангаў групе адважных партызан. Жана была паранена, але не пакідала поля боя і да апошняга ўздыху вяла агонь па фрыцах. Паўшы смерцю храбрых, Марыя Кірэеўна Раманенка пакінула ў нашых сэрцах свой образ благароднага патрыятызму і адвагі.

За яе гібель дзесяткі фрыцаў налажылі галовамі, узлятаючы ў паветра ад рук партызан—таварышоў нашай Жаны.

СЯМЁНАЎ,
атрад імя К.

## Дружна правядзем сеў яравых

Наложаныя нямецкімі крывясмокамі налогі наша вёска сістэматычна зрывала. За час вайны сяляне нашай вёскі не здалі нямчуры ні аднаго грама збожжа, мяса і бульбы. Мы не хочам, каб немец пхаў у сваю глотку хлеб, апрацаваны нашым потам і нашымі рукамі. Хай чорнай зямлёй напхае немец сваё чэрава.

Мы дапамагаем партызанам, знаходзімся пад аховай партызан і рыхтуемся зараз к яраваму севу. Мы ведаем, што будзем здымаць гэты ўраджай у той час, калі тут і нямецкага духу не застанецца. Здымаць гэты ўраджай мы будзем спакойна, пад аховай магутнай Чырвонай Арміі. Мы старанна падрыхтоўваемся к севу яравых і прызываем усіх сялян другіх вёсак дружна правесці сеў яравых, каб забяспечыць высокі ўраджай і падрыхтаваць больш хлеба для роднай Чырвонай Арміі.

ЮСІФ Б.,
селянін энскай вёскі

Максім ТАНК

## Да зброі, Беларусь!

Калі пачуеш пах жывіцы
І звон расцвіўшых верасоў,
Знай—блізка родныя граніцы,
Твой край юнацтва, край
бацькоў.

Калі убачыш хмары дыму,
Курганаў свежыя сляды,
Знай—тут за волю, за радзіму
Твае змагаліся браты.

Калі Масква салюту громам
Ускалыхне, як сцяг, зару,
Знай—мы ізноў прышлі дадому,
Прабіліся на Беларусь.

Тады, баец і мой таварыш,
З якіх-бы не прышоў шляхоў,
З гарачай ласкай прывітаюць
Цябе ля гэтых рубяжоў:

Бары, узняўшыся да зораў,
Дняпро і Нёман, і палі,
Што неліняючым узорам
Парассцілаліся ўдалі;

Абдымуць маткі і сіроты,
Бацькі якіх тут у баю
Ля партызанскіх кулямётаў
Ляглі за Беларусь сваю.

Да зброі, Беларусь, да зброі!
Салют Масквы табе грыміць.
Выходзь сустрэць брата-героя
І лютых ворагаў дабіць.

А ты, баец, адпомсці катам
За ўсіх замучаных братоў,
Хай на штыку тваім расплатай
Фашысцкая не стыне кроў.

Бо толькі там, дзе помста
пройдзе
І спапяліць варожы прах,
Як некалі, ізноў узойдзе
Руњ маладая на палях.

## У вызваленых раёнах Беларусі

У Касцюковіцкім раёне адноўлена 20 пачатковых і няпоўных сярэдніх школ, пенькавод, скурзавод, і абутковая арцель. Адкрыта больніца на 60 коек, працуе дзве лазні і сталовая. У калгасе „Зара" Сіліцоўскага сельсовета гэтага раёна, дзе фашысцкія варвары спалілі калгасныя пабудовы і шмат двароў калгаснікаў, кіпіць аднаўленчая работа. Калгаснікі пабудавалі новую канюшню і шмат дамоў.

*** У Мсціслаўлі пушчаны чатыры млыны, хлебапякарня, цырульня, смалакураны і спіртавы завод.

*** Наркамздраў БССР накіраваў у вызваленыя раёны Гомельскай і Магілёўскай абласцей групу ўрачоў, санітарных інспектароў і эпідэміолагаў. Адпраўлены розныя медыкаменты, перавязачныя матэрыялы, інструменты, дэзінфекцыйныя матэрыялы — хлорная вапна, хлорамін, а таксама мыла, бялізна.

*** У вызваленых раёнах Магілёўскай вобласці адчынены 6 дзіцячых дамоў з ахопам 720 дзяцей, бацькі якіх загінулі ў час нямецкай акупацыі. Дзеці забяспечваюцца харчаваннем і адзеннем.

*** Арганізаван промкамбінат у горадзе Клімавічах: у швейнай майстэрні арганізаван рамонт адзежы, у шавецкай майстэрні—рамонт абутку. Прыстасаван млын, рыхтуецца да пуску другі млын каля Клімавіч.

*** У Крычаўскім раёне адноўлены млыны ў вёсках Мышкаўцы, Цімкаве, Дзягавічах. Лесапільны завод, мылаварны завод ужо даюць прадукцыю. Арганізоўваецца вытворчасць чарапіцы.

*** Для аднаўлення трактарнага парка Беларусі МТС Іванаўскай вобласці высылаюць 185 трактароў.

*** У вызваленых раёнах Магілёўскай вобласці ўжо адноўлена 185 школ, у якіх навучаюцца тысячы дзяцей.

РЭДКАЛЕГІЯ.

Выданне Грэскага РК КП(б)Б Друкарня газеты „Сталінец".

[library stamp]